http://edoc.bseu.by:8080

4. Штейнхардт, Л. Юнгианская песочная психотерапия / Л. Штейнхардт. – СПб.: Питер, 2001. – 320 с.: ил. – (Серия «Практикум по психотерапии»).
5. Эль, Г. Н. Человек, играющий в песок. Динамичная песочная терапия // Г. Н. Эль. – СПб.: Речь, 2010. – 208 с.

*П. У. Хлюст*
*Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт*
*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

## ЗНАЧНАСЦЬ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКІМ КАНТЭКСЦЕ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

Устойлівае развіццё можна ахарактарызаваць як «сацыяльна пажаданае, эканамічна жыццяздольнае і экалагічна ўстойлівае развіццё грамадства»[1, с. 1].

Якое месца ў канцэпцыі ўстойлівага развіцця адводзіцца гісторыка-культурнай спадчыне і яе нематэрыяльнай частцы?

Разбярэм на прыкладах, як аб'екты нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны спрыяюць устойліваму развіццю ў сацыяльным, эканамічным і экалагічным кантэкстах.

Сацыяльны кантэкст. Грамадства пастаянна ўдасканальвала і прыстасоўвала досвед сваіх продкаў, у прыватнасці веды і звычаі, а таксама сацыяльныя традыцыі, для таго каб задаволіць асноўныя патрэбы і вырашыць магчымыя праблемы. Прыкладам нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны тут з'яўляюцца традыцыйныя методыкі лекавання, звычаі, звязаныя з падрыхтоўкай і ўжываннем ежы, грамадскія мерапрыемствы, святы – усё гэта адыгрывае важную ролю ў жыцці супольнасцяў.

Нематэрыяльная культурная спадчына можа спрыяць умацаванню сацыяльнай згуртаванасці і інтэграцыі. Звычаі, абрады і святочныя мерапрыемствы дапамагаюць у арганізацыі жыцця супольнасцяў і груп. Ахопліваючы ўсіх удзельнікаў, яны могуць гуляць ключавую ролю ва ўмацаванні іх сацыяльнага побыту. Добрым прыкладам у Беларусі з'яўляецца «Будслаўскі фэст», штогадовая ўрачыстасць у гонар ушанавання абраза Маці Божай Будслаўскай, які захоўваецца ў касцёле Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай

вобласці. Абраз славіцца шматлікімі цудамі, а Будслаў вядомы як месца яўлення вернікам Найсвяцейшай Дзевы Марыі, якое, паводле легенды, адбылося 2 ліпеня 1588 г. 28 лістапада 2018 года фэст уключаны ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва ЮНЕСКА. Традыцыю ўшанавання абраза Маці Божай Будслаўскай вернікі пераймаюць у сям'і ці праз царкоўныя суполкі. На фэст часта прыязджаюць сем'ямі, прысутнічаюць вернікі рознага ўзросту, што садзейнічае захаванню сувязей паміж пакаленнямі [4].

Мноства звычаяў – ад невялікіх сустрэч да маштабных ўрачыстых мерапрыемстваў і святкаванняў – дапамагаюць умацаваць сацыяльную повязь і згуртаванасць супольнасці шляхам фарміравання агульнай ідэнтычнасці.

Экалагічны кантэкст. Нематэрыяльная культурная спадчына можа садзейнічаць у справе захавання ўстойлівасці навакольнага асяроддзя. На фоне павялічанага і няўстойлівага спажывання прыродных рэсурсаў у выніку чалавечай дзейнасці на глабальным узроўні мноства мясцовых супольнасцяў выпрацавалі лад жыцця і стварылі традыцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якія непарыўна звязаныя з прыродай і спрыяюць беражлівым адносінам да навакольнага асяроддзя.

Рацыянальныя народныя веды беларусаў у галіне паляводства, агародніцтва, садоўніцтва можна з поспехам выкарыстоўваць і ў сучаснай сельскай гаспадарцы, асабліва ў фермерскіх і прыватных падсобных гаспадарках, якія працуюць у сферы аграэкатурызму і займаюцца вырошчваннем экалагічна чыстай, «арганічнай» прадукцыі. Пільную ўвагу аграрыяў-практыкаў, у першую чаргу, прыцягваюць механічныя сродкі барацьбы са шкоднікамі агароднінных культур; народныя спосабы зберажэння вільгаці ў глебе, барацьбы з пустазеллем; выяўленыя ў выніку шматгадовых назіранняў ўзаемасувязі паміж сутачнымі тэрмінамі касьбы і якасцю сена, а таксама ўплыў фаз месяца на спрыяльны або неспрыяльны вынік розных агратэхнічных работ [3,с. 68].

У народных ведах аб дзікарослых раслінах выяўляецца беражлівыя адносіны да навакольнага флоры, у першую чаргу, да лясных рэсурсаў. Сяляне ніколі не секлі дрэвы без патрэбы, не знішчалі грыбныя і ягадныя рэсурсы. Традыцыйныя спосабы збору бярозавага соку практычна не пашкоджвалі дрэва [3, с. 64].

Нематэрыяльная культурная спадчына можа дапамагчы ў абароне біяразнастайнасці і спрыяць захаванню ўстойлівасці навакольнага асяроддзя.

Эканамічны кантэкст. Устойлівае развіццё залежыць ад стабільнага эканамічнага развіцця, заснаванага на ўстойлівых мадэлях вытворчасці і спажывання. Комплекснае эканамічнае развіццё накіравана не толькі на асоб, аднесеных да катэгорыі бедных, але і на ўразлівыя групы насельніцтва з ненадзейнымі крыніцамі сродкаў да існавання. Нематэрыяльная культурная спадчына з'яўляецца важным чыннікам эканамічнага развіцця мясцовых супольнасцяў.

Мясцовыя веды, навыкі і традыцыі, якія, з цягам часу, захоўваюцца і ўдасканальваюцца, дапамагаюць забяспечыць людзей сродкамі да існавання. Напрыклад, традыцыі шапавальства ў Магілёўскай вобласці. Шапавальства – шэрстабітны і валяльны промыслы, традыцыйнае мастацтва вырабу з воўны (валенне, качанне) галаўных убораў, валёнак. У цяперашні час шапавалы на Беларусі дзейнічаюць толькі ў Дрыбінскім раёне на Магілёўшчыне. У шэрагу вёсак, дзе існуе авечкагадоўля, гаспадыні займаюцца апрацоўкай воўны для ткацтва посцілак і вязання прадметаў адзення. Пры Дрыбінскім раённым гістарычна-этнаграфічным музеі створана аматарскае аб'яднанне «Шапавал», якое займаецца захаваннем, вывучэннем і перадачай наступным пакаленням сакрэтаў майстэрства шапавалаў, а таксама дзіцячы гурток «Катрушнік». Такі лад жыцця дазваляе людзям знаходзіць сродкі да існавання і служыць крыніцай іх самабытнасці [2, с.44–48].

Супольнасці таксама могуць атрымаць карысць ад турыстычнай дзейнасці, якая звязана з нематэрыяльнай культурнай спадчынай. Магчымасць адкрыцця багатай разнастайнасці традыцый, святочных мерапрыемстваў, унікальных відаў мастацтваў, навыкаў, звязаных з традыцыйным рамяством і іншых абласцей нематэрыяльнай культурнай спадчыны – усё гэта можа спрыяць прыцягненню турыстаў на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях. Спрыяючы фарміраванню пачуцця гонару ў супольнасці, гэтыя віды турыстычнай дзейнасці прыносяць даход і стымулююць стварэнне новых працоўных месцаў. Варта адзначыць і тое, што, калі ў сферы турызма назіраецца непаважлівае стаўленне да гісторыка-культурнай спадчыны, гэта можа паставіць яе пад пагрозу. Таму, пры вядзенні турыстычнай дзейнасці (незалежна ад таго, вядзецца яна дзяржавай, грамадскай або прыватнай арганізацыяй) вельмі важна звяртаць належную ўвагу на ахову нематэрыяльнай культурнай спадчыны, паважліва ставіцца да правоў, памкненняў і жаданняў носьбітаў традыцый. Апошнія павінны заставацца галоўнымі бенефі-

цыярамі. Турызм, заснаваны на этычных прынцыпах з улікам разумення спецыфікі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінен пазбягаць любога магчымага негатыўнага ўплыву на спадчыну і рэгуляваць паводзіны тых, хто ўключаны ў турыстычную дзейнасць, у тым ліку саміх турыстаў [5, с. 19–20].

Эканамічныя, сацыяльныя і экалагічныя напрамкі ўстойлівага развіцця цесна ўзаемазвязаны. Нематэрыяльная культурная спадчына можа эфектыўна садзейнічаць ўстойліваму развіццю ў кожным з гэтых кірункаў. Такім чынам, яе ахова мае прынцыповае значэнне ў дасягненні будучага, якога мы хочам для ўсіх.

## Літаратура

1. Гришин, А. И., Гришина, О. А. Историко-культурное наследие в контексте устойчивого развития / А. И. Гришин, О. А. Гришина // Вестник Российского экономического университета имени Г. В. Плеханова. – 2012. – № 5 (47).

2. Суша, Г. А. Традыцыйнае мастацтва шапавальства: адраджэнне рамяства / Г. А. Суша // Веснік Інстытута культуры Беларусі. – 2013. – № 2. – С. 44–48.

3. Шумскі, К. А. Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX – пачатку XXI ст. / К. А. Шумскі. – Мінск: БДАТУ, 2011. – 192 с.

4. Celebration in honor of the Budslau icon [Electronic resource]: ich.unesco.org. – Mode of access: https://ich.unesco.org/en/RL/celebration-in-honor-of-the-budslau-icon-of-our-lady-budslau-fest-01387. – Date of access: 01.11.2019.

5. EU 2030 Agenda: what role for culture [Electronic resource]: ietm.org. – Mode of access: https://www.ietm.org/en/EU-2030-Agenda. – Date of access: 02.11.2019.